Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
_________________А.І.Жук
“_17_“__04_______________2024 г.
Рэгістрацыйны № УД-_________/вуч.
УД-26-1-549-2024/уч.

# ГІСТОРЫЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:

1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны,
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура,
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе агульнаадукацыйных стандартаў і вучэбных планаў спецыяльнасцей: 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны (№ 016-2021/у ад 15.07.2021); 1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура (№ 017-2021/у ад 15.07.2021); 1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа (№ 018-2021/у ад 15.07.2021)

**СКЛАДАЛЬНІК:**

А.Ф.Рацько, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Т.В.Доўгач, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі IX–XVIII стагоддзяў і археаграфіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

А.А.Сурма, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Намеснік дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 40 імя Я.Лучыны г. Мінска» А.У.Цішчанка

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў (пратакол № 8 ад 26.03.2024).

Загадчык кафедры С.А.Талмачова

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 6 ад 16. 04. 2024).

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ А.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма "Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі" прызначана для рэалізацыі агульнай вышэйшай адукацыі. Яна скіравана на авалоданне студэнтамі асноўнымі тэарэтычнымі дасягненнямі гістарычнай навукі, апрацоўку, асэнсаванне і сістэматызацыю вучэбнай інфармацыі, набыццё практыкаарыентаваных уменняў.

Вялікую ролю ва ўзнаўленні праўдзівага мінулага прызвана адыграць гісторыя грамадскай думкі нашага народа, без вывучэння якой немагчыма правільнае разуменне і ўсебаковае адлюстраванне гістарычнай мінуўшчыны. Вывучэнне грамадска-палітычнай думкі Беларусі прызвана таксама спрыяць фарміраванню нацыянальнай свядомасці, нацыянальнай годнасці, гонару за сваю культуру, сваю гісторыю, свой народ, які стварыў сапраўдныя духоўныя каштоўнасці на працягу ўсёй шматвекавой гісторыі.

Грамадска-палітычная думка Беларусі – гэта адносіны розных груп людзей, пэўных асоб да падзей і фактаў сацыяльнага жыцця, стан масавай свядомасці, які адлюстроўвае погляды грамадства або яго часткі на з’явы і працэсы сацыяльна-палітычнай і сацыяльна-культурнай рэчаіснасці, на дзейнасць пэўных асоб, груповак, арганізацый.

Мэтай вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца вывучэнне працэсу ўзнікнення і гістарычнага развіцця тэарэтычных палажэнняў аб дзяржаве, праве, палітыцы і заканадаўстве, выказаных нацыянальнымі мысліцелямі, рэлігійнымі, грамадскімі і дзяржаўнымі дзеячамі, правазнаўцамі, пісьменнікамі, паэтамі ў той ці іншай форме**.**

Для дасягнення пастаўленай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных даследчых і вучэбных **задач**:

- выявіць ступень распрацаванасці вучэбнага курса па перыядах;
- фарміраваць у студэнтаў патрыятычны светапогляд, тлумачыць асновы і прыярытэты ідэалогіі беларускай дзяржавы;
- прасачыць карціну гістарычнага развіцця беларускай канцэпталогіі;
- раскрыць нацыянальны характар інтэрпрэтацыі агульнаеўрапейскай і беларускай культуры і грамадска-палітычнай думкі;
- паказаць сувязь паміж становішчам канфесій і беларускім этнакультурным уздымам у канцы XVI – першай палове XVII ст.; у другой палове XIX – пачатку XX ст.; 20-я гады XX ст.;
- на фоне дынамікі этнакультурных працэсаў у Беларусі даследаваць і вывучаць моўную палітыку і практыку праваслаўнай, каталіцкай, уніяцкай цэркваў, іх уплыў на развіццё грамадска- палітычнай думкі, рухаў;
- разглядаць грамадска-палітычную думку праз прызму нацыянальнай культуры і этнічнай свядомасці народа;
- знаёміць з жыццём і дзейнасцю, духоўнай спадчынай выдатных дзеячаў гісторыі, навукі, культуры, палітыкі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

- асноўныя падзеі і факты ў гісторыі Беларусі;

- асаблівасці сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага, культурнага развіцця Беларусі ў канкрэтна-гістарычныя перыяды;

**умець:**

- выкарыстоўваць матадалогію гістарычнай навукі для аналізу гістарычнага развіцця беларускага грамадства;
- выяўляць асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця беларускай нацыі ў канкрэтна-гістарычныя перыяды;

**валодаць:**

- веданнем этапаў фарміравання беларускай народнасці і нацыі;
- выкарыстаннем гістарычнага вопыту для аналіза і ацэнкі сучасных праблем у развіцці Беларусі.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя Беларусі" павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных кампетэнцый:

УК-4 Працаваць у калектыве, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;

БПК Выдзяляць асноўныя перыяды, тэндэнцыі і заканамернасці сацыяльных, эканамічных, палітычных, этна-нацыянальных, рэлігійна-канфесійных і культурных падзей і працэсаў, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі.

Пры вывучэнні кожнай тэмы студэнты павінны карыстацца як канкрэтна-гістарычнымі (гісторыка-генетычным, гісторыка-параўнальным, гісторыка-тыпалагічным, гісторыка-сістэмным і інш.), так і агульнанавуковымі (мадэліравання, індукцыі і дэдукцыі, сінтэзу і аналізу, узыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага і наадварот, аналогіі і інш.), метадамі гістарычнага пазнання.

У рамках адукацыйнага працэсу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіваць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі" на дзённай форме атрымання адукацыі вучэбнам планам адводзіцца 100 гадз. (3 зал. адз.), з іх аўдыторных – 48 гадзін: 22 гадзіны лекцыйныя заняткі, 26 гадзін семінарскія заняткі (з іх на кіруемую самастойную работу студэнтаў – 8 гадзін – семінарскія заняткі). Пазааўдыторная самастойная работа – 52 гадзіны. Залік ў 7 семестры.

На завочнай форме атрымання адукацыі на вучэбную дысцыпліну "Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі" адводзіцца ўсяго 100 гадз. (3 зал. адз.), аўдыторных – 12 гадзін: з іх 4 гадзіны – лекцыйныя заняткі, 8 гадзін – семінарскія заняткі. Самастойная работа – 88 гадзін. Залік у 9 семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Прадмет гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі як навукі і вучэбнай дысцыпліны. Метадалагія гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Крыніцы, перыядызацыя.**

Прадмет гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Месца гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў сістэме гуманітарных дысцыплін. Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння курса. Сувязь з іншымі навукамі. Крыніцы вывучэння дысцыпліны. Перыядызацыя беларускага гісторыка-палітычнага працэсу. Значэнне гісторыі грамадска-палітычнай думкі ў фарміраванні палітычнай і прававой культуры.

**Тэма 2. Зараджэнне грамадска-палітычнай думкі на беларускіх землях у XI–XIII стст. Палітычны змест старажытнарускіх летапісаў.**

Грамадская думка дахрысціянскай пары. Язычніцтва – светапоглядная аснова духоўнага жыцця старажытных насельнікаў Беларусі. Фальклор – як адлюстраванне грамадска-палітычнай думкі.

Фактары, якія ўплывалі на фарміраванне грамадска-палітычнай думкі на старажытна-беларускіх землях XI – XIII ст. Кіеўская Русь і яе роля ў гісторыі ўсходнеславянскіх народаў. Полацкае і Тураўскае княствы.

Прычыны і гістарычныя ўмовы распаўсюджвання хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях. Барацьба хрысціянскай царквы за ідэалагічную манаполію ў духоўным жыцці ўсходнеславянскага грамадства. Сутнасць ідэалогіі цэзарапапізма і прычыны яе зацвярджэння ў палітычнай думцы Беларусі XI–XIII стст. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы і іх роля ў распаўсюджванні хрысціянскай маралі. Е. Полацкая, К. Тураўскі, К. Смаляціч. Уплыў духавенства на ідэалагічнае жыццё дзяржавы. Палітычныя ідэі старажытных летапісаў і "Слова пра паход Ігаравы".

**Тэма 3. Грамадска-палітычная думка ў перыяд станаўлення беларускага этнаса і ўмацавання дзяржаўнасці (другая палова XIII-XV ст.). Палітычныя ідэі беларуска-літоўскіх летапісаў (XIV–XVI стст.)**

Фарміраванне ВКЛ як поліэтнічнай дзяржавы: сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы. Асаблівасці развіцця грамадска-палітычных працэсаў у ВКЛ. Палітычны мір літоўска-беларускага сярэднявяковага грамадства.

Прынясце каталіцызму, знаёмства з заходне-еўрапейскай царкоўна-палітычнай ідэалогіяй папства. Уплыў ідэалогіі каталіцызму на грамадска-палітычную думку ВКЛ. Ідэя царкоўнай незалежнасці праз стварэнне аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Барацьба за аўтакефалію ў часы кіравання Гедыміна, Альгерда, Вітаўта, Казіміра. Сярэдневековыя ерасі. Грамадска-палітычныя погляды і царкоўная дзейнасць Р. Цамблака. Ідэя ўніі паміж праваслаўнай і каталіцкай царквамі ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі XIV-XV стст. Спробы яе рэалізацыі.

Беларуска-літоўскія летапісы і хронікі, як крыніцы актуальных грамадска-палітычных ідэй XIV – XV стст. ("Летапіс вялікіх князёў літоўскіх", "Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.", "Хроніка Быхаўца" і інш.).

**Тэма 4. Грамадска-палітычная думка ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі (канец XV – сярэдзіна XVI ст.)**

Характарыстыка грамадска-палітычнага жыцця Еўропы ў Новы час. Распаўсюджване гуманістычнай ідэі. Асноўныя ідэі і прынцыпы эпохі Адраджэння, іх асаблівасці ў ВКЛ.

Прадмовы і пасляслоўі Ф. Скарыны – галоўныя крыніцы вывучэння светапогляду ўсходнеславянскага першадрукара. Палітычны ідэал Ф. Скарыны. Грамадска-палітычныя погляды М. Гусоўскага. Актуальныя палітычныя праблемы ў паэме "Песня пра зубра". М. Літвін. Погляды на грамадства М. Літвіна. Сацыяльна-палітычны трактат "Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян".

Лютэранства, кальвінізм, антытрынітарызм – напрамкі пратэстантызма, распаўсюджаныя на тэрыторыі Беларусі ў XVI ст. А. Кульва – прапаведнік лютэранскіх ідэй у ВКЛ. Рэспубліканскія і дэмакратычныя ідэі кальвінізму. М. Радзівіл Чорны – ідэолаг кальвінізму, галоўны ініцыятар распаўсюджвання кальвінізму ў ВКЛ. "Брэсцкая, альбо Радзівілаўская Біблія".

Грамадска-палітычная погляды А. Валовіча, А. Волана. Палітычныя погляды правага крыла арыян (Я. Кішка, С. Будны, В. Цяпінскі). Ідэалогія левага крыла арыян (П. Гезка, М. Чаховіц, Л. Крышкоўскі, Якуб з Калінаўкі, Павел з Візны і інш.). Іх адносіны да дзяржавы, уласнасці, удзелу хрысціян у войнах.

Грамадска-палітычныя погляды Л.Сапегі.

**Тэма 5. Грамадска-палітычная думка ў гады контррэфармацыі (канец XVI – першая палова XVII ст.)**

Узнікненне Контррэфармацыі ў Еўропе, яе сутнасць, мэты. Распаўсюджванне контррэфармацыйных ідэй у ВКЛ. Дзейнасць ордэна езуітаў. Адкрыццё езуіцкіх сярэдніх вучэбных устаноў – калегіумаў. Стварэнне Віленскай езуіцкай акадэміі.

Брэсцкая царкоўная ўнія і палеміка вакол яе. Барацьба ідэалагічных напрамкаў. Пётр Скарга – галоўны ініцыятар заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі, лідэр Контррэфармацыі, першы рэктар Віленскай езуіцкай акадэміі. Ідэалагічнае абгрунтаванне неабходнасці царкоўнага аб'яднання праваслаўных з каталікамі Рэчы Паспалітай. Твор П. Скаргі "Аб адзінстве царквы божай".

А. Пасевін – ініцыятар заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі. "Масковія" – каштоўная крыніца па грамадска-палітычнай і прававой думцы Беларусі XVI ст.

Грамадска-палітычныя погляды прыхільнікаў і праціўнікаў уніі. І. Пацей – ініцыятар заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі. Прыхільнікі уніі: І. Руцкі, І. Кунцэвіч і інш. Прыхільнікі праваслаўя: Л. і С. Зізаніі, М. Сматрыцкі, П. Магіла, А. Філіповіч і інш.

Ідэалогія сарматызму і павелічэнне каставасці шляхецкага стану грамадства ў Рэчы Паспалітай.

Культурна-асветніцкая дзейнасць К. Астрожскага супраць каталіцкай ідэалогіі. Астрожская Акадэмія – вышэйшая праваслаўная навучальная ўстанова. Яе

роля ў фарміраванні светапогляду беларускага народа. Пасланне К. Астрожскага да праваслаўных Рэчы Паспалітай.

**Тэма 6. Грамадска-палітычная думка ў перыяд крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін і панавання клерыкальнай ідэалогіі (сярэдзіна XVII – першая палова XVIII ст.). Адлюстраванне асветніцкіх ідэй у палітычнай думцы Беларусі (XVIII ст).**

Уплыў войнаў і сацыяльных канфліктаў сярэдзіны XVII – першай паловы XVIII ст. на грамадска-культурнае жыццё беларускага грамадства. Панаванне каталіцкай царквы ў сферы адукацыі і выхавання моладзі. Дзейнасць брацкіх друкарняў і школ.

Атэістычныя і сацыяльна-утапічныя погляды К. Лышчынскага. Трактат "Аб неіснаванні бога".

Грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць С. Полацкага. С. Полацкі – прыхільнік і праваднік ідэалогіі асветніцкага абсалютызму ў Расіі.

Рэфарматарская дзейнасць і грамадска-палітычныя погляды М. Пачобута-Адляніцкага.

Гістарычныя ўмовы развіцця Асветніцтва ў другой палове XVIII ст. Асаблівасці асветніцкай ідэалогіі ў Беларусі і Літве, яе супярэчлівасць, непаслядоўнасць. Антыпрыгонніцкія ідэі асветнікаў (М. Карповіч, К. Багуслаўскі).

Сутнасць ідэалогіі фізіакратызму. Асветнікі-рэфарматары ў Беларусі: І. Страйноўскі, І. Храптовіч, А. Тызенгауз, П. Бжастоўскі і інш. Крытыка сацыяльна-палітычнага ладу. Праграма рэфармавання грамадства.

Дысідэнцкі рух. Грамадска-палітычныя ідэі Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Погляды лідэраў паўстання 1794 г. Т. Касцюшкі і Я. Ясінскага.

**Тэма 7. Развіццё грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (1795 г. – канец XIX ст.).**

Фарміраванне асноўных грамадска-палітычных тэорый у Еўропе на пачатку XIX ст. Кансерватызм, лібералізм, палітычны рамантызм.

Асноўнае пытанне нацыянальнай грамадска-палітычнай думкі канца XVIII– пачатку XIX ст.: адраджэнне дзяржаўнасці, пошук шляхоў да нацыянальнай самастойнасці. Праект адраджэння палітычнай самастойнасці ВКЛ М.К. Агінскага.

Віленскі ўніверсітэт як ідэйны цэнтр лібералізма і вольнадумства. Палітычныя і прававыя погляды сяброў тайных студэнцкіх таварystваў Віленскага ўніверсітэта – філаматаў і філарэтаў (А. Міцкевіч, Ю. Яжоўскі, Т. Зан, І. Дамейка і інш.). Полацкая езуіцкая акадэмія.

Ідэі культурна-нацыянальнага адраджэння ў літаратуры першай паловы XIX ст. (Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, А. Рыпінскі, У. Сыракомля, В. Дунін-Марцінкевіч). Гістарычная ліцвінская свядомасць – светапоглядная аснова палітычных поглядаў А. Кіркора.

Узмацненне кансерватыўнага напрамку ў грамадска-палітычнай думцы пасля паўстання 1830-1831 гг. Уплыў рэвалюцыі 1848 г. у Заходняй Еўропе на палітычную думку Беларусі. Палітычная думка Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. Адраджэнне

лібералізму ў канцы 50-х – пачатку 60-х гг. Браты Я. і К. Тышкевічы, Т. Нарбут, Ю. Крашэўскі і інш.

Адмена прыгоннага права. Буржуазныя рэформы 60 – 70-х гг. ХІХ ст.: асаблівасці іх правядзення ў Беларусі. Паўстанне 1863 – 1864 гг. і яго ўплыў на палітыку ўладаў Расійскай імперыі ў беларускіх губернях. Ліберальна-буржуазны напрамак грамадска-палітычнай думкі Беларусі 80–90 гг. "Мінскі лісток" – орган беларускай ліберальнай думкі. Погляды М. Каяловіча, І. Саланевіча, К. Гаворскага. Рэвалюцыйна-дэмакратычны кірунак грамадска-палітычнай думкі Беларусі: М. Валовіч, Ю. Бакшанскі, браты Ц. і Ф. Далеўскія. Ф. Савіч і арганізацыя "Дэмакратычнае таварыства".

**Тэма 8. Грамадская думка і палітычныя плыні ў канцы ХІХ – першай трэці ХХ ст.**

Грамадска-палітычныя погляды Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча. Часопіс "Гоман" і яго праграма федэратыўнай аўтаноміі Беларусі. Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады. Спалучэнне ідэі сялянскага (народніцкага) сацыялізма з патрабаваннем нацыянальнага адраджэння ў праграме БСГ. Уздым нацыянальнага беларускага руху ў час Першай расійскай рэвалюцыі (1905–1907 гг.). Нацыянальна-асветніцкая і рэвалюцыйна-прапагандысцкая дзейнасць першых беларускамоўных газет: "Наша Доля" і "Наша Ніва".

Роля мастацкай літаратуры пачатку ХХ ст. у фарміраванні нацыянальнай свядомасці беларусаў (З. Жылуновіч, Я. Купала, Я. Колас, Цётка і інш.).

Асноўныя цэнтры беларускага вызваленчага руху ў гады Першай сусветнай вайны. Распрацоўка канцэпцыі нацыянальнай дзяржаўнасці Беларускім народным камітэтам (БНК) у Вільні. Станаўленне нацыянальна-дзяржаўнай ідэі ў праграмных дакументах беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску (БНК, ЦБР, ЦВБР, ВБР). Ідэі дакументаў, прынятых першым Усебеларускім з’ездам (снежань 1917 г.). Пытанні нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў праграмных дакументах БНР (Устаўныя граматы). Абгрунтаванне права Беларусі на свабоднае дэмакратычнае развіццё ў творчай спадчыне ідэолагаў нацыянальнага Адраджэння І. і А. Луцкевічаў, В. Ластоўскага, А. Смоліча, Я. Лёсіка, А. Цвікевіча і інш. Грамадска-палітычныя погляды І. Абдзіраловіча (Канчэўскага).

**Тэма 9. Грамадска-палітычная думка Савецкай Беларусі (1919-1939 гг.). Грамадска-палітычны рух у Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.).**

Грамадска-палітычная думка ў перыяд станаўлення беларускай дзяржаўнасці (1918–1920-я гг.). Шляхі фарміравання беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай і рэвалюцыйна-класавай асновах. Пазіцыя бальшавікоў у нацыянальным пытанні. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці.

Грамадска-палітычная думка БССР у 1920-я гг. Ваенна-камуністычная ідэалогія і нацыянальнае пытанне. В. Кнорын. Нацыянальна арыентаваныя камуністы іх погляды на праблему беларускай дзяржаўнасці. А. Чарвякоў. В. Ігнатоўскі. Ідэалогія нацыянал-дэмакратызму.

Асноўныя характарыстыкі савецкага грамадска-палітычнага жыцця. Станаўленне і развіццё савецкай ідэалагічнай сістэмы. Разгром палітычнай апазіцыі ў пачатку 1920-х гг. завяршэнне фарміравання аднапартыйнай сістэмы. Замацаванне манаполіі камуністычнай партыі ў грамадска-палітычным жыцці БССР.

Канстытуцыя БССР 1927 г. Дасягненні ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Беларусізацыя як частка нацыянальнай дзяржаўнай палітыкі. Унутрыпартыйная барацьба ў БССР (1920-я гг.). Разгром беларускага нацыянал-дэмакратызму. Змены ў савецкай дзяржаўнай сістэме і іх адлюстраванне ў Канстытуцыі БССР 1937 г. Асноўныя характарыстыкі грамадскай сістэмы ў БССР (1920-1930-я гг.).

Грамадска-палітычнае, эканамічнае, нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух ў Заходняй Беларусі. Грамадска-палітычныя погляды дзеячоў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (І. Лагіновіч, А. Славінскі, С. Прытыцкі і інш.). Ідэалогія Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Грамадска-палітычныя погляды беларускай дэпутацкай фракцыі польскага сейма ў 1928–1930 гг. «Змаганне». Дзейнасць і погляды І. Дварчаніна, Б. Тарашкевіча, А. Станкевіча і інш.

**Тэма 10. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР (1950-я – другая палова 1980-х гг.).**

Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Ідэалагічныя кампаніі і неабгрунтаваныя рэпрэсіі па палітычных матывах другой паловы 1940-х – 1953 гг. Асуджэнне культа асобы І.В. Сталіна. Асаблівасці працэсу дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1950-х – 1964 гг. Нарастанне кансерватызму ў грамадска-палітычным жыцці ў 1970-я – першай палове 1980-х гг. Бюракратызацыя партыйна-дзяржаўнага апарату. Узмацненне фармалізацыі ў жыцці і дзейнасці грамадскіх арганізацый.

Палітыка-эканамічныя рэаліі канца 80-х пачатку 90-х гг. XX ст. і іх уздзеянне на грамадска-палітычную думку Беларусі. Спробы рэфармавання палітычнай сістэмы ў гады перабудовы. Нефармальныя грамадскія арганізацыі, пачатак пераходу да шматпартыйнасці. Крытычны аналіз гісторыі СССР, палітычнай практыкі КПСС і савецкага кіраўніцтва ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі. Развіццё гістарычнай думкі.

**Тэма 11. Грамадска-палітычная думка Рэпублікі Беларусь ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту (1990-2020-я гг.). Станаўленне новых духоўных каштоўнасцей ў грамадстве.**

Грамадска-палітычная думка Беларусі ва ўмовах распаду СССР. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Пераход ад парламенцкай да прэзідэнтскай рэспублікі. Распрацоўка і прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. і першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фарміраванне новай сістэмы ўлады. Рэферэндумы 1995, 1996, 2004, 2022 гг. і іх уплыў на стабілізацыю становішча ў краіне. Роля сучасных палітычных партый і грамадскіх аб’яднанняў у грамадска-палітычным жыцці краіны. Усебеларускі народны сход – вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь.

Стан гісторыка-культурнай спадчыны. Адлюстраванне грамадска-палітычнага стану грамадства ў сучасных творах літаратуры і мастацтва. Узаемаадносіны дзяржавы і царквы, адраджэнне рэлігійна-канфесійнага жыцця. Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**“Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі” для спецыяльнасцей:**
**1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны, 1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура,**
**1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа**
**(дзённная форма атрыманння адукацыі)**

| № раздела, тэмы | Назва раздела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Самастойная (пазааўдыторная) работа | Метадычныя сродкі забяспячэння, дапаможнікі | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | Кіруемая самастойная работа | | | | |
| **1** | **Тэма 1. Прадмет гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі як навукі і вучэбнай дысцыпліны. Метадалагія гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Крыніцы, перыядызацыя.**<br>1.Агульная характарыстыка “Гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі” як навуковай дысцыпліны.<br>2.Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння курса.<br>3.Перыядызацыя беларускага гісторыка-палітычнага працэсу.<br>4.Крыніцы вывучэння дадзенай дысцыпліны, яе актуальнасць. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2** | **Тэма 2. Зараджэнне грамадска-палітычнай думкі на беларускіх землях у XI–XIII стст. Палітычны змест старажытнарускіх летапісаў.**<br>1. Грамадская думка дахрысціянскай пары. Язычніцтва – светапоглядная аснова духоўнага жыцця старажытных жыхароў Беларусі.<br>2. Кіеўская Русь і яе роля ў гісторыі ўсходнеславянскіх народаў. Полацкае і Тураўскае княствы.<br>3. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя фактары, якія ўплывалі на фармаванне ўсходнеславянскай грамадска-палітычнай думкі. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |
| 2.1 | 1. Прычыны і гістарычныя ўмовы распаўсюджвання хрысціянства ва ўсходнеславянскіх землях.<br>2. Барацьба хрысціянскай царквы за ідэалагічную манаполію ў духоўным жыцці ўсходнеславянскага грамадства.<br>3. Сутнасць ідэалогіі цэзарапапізма і прычыны яе зацвярджэння ў палітычнай думцы Беларусі XI-XIII стст.<br>4. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы і іх роля ў распаўсюджванні хрысціянскай маралі. Е. Полацкая. К. Смаляціч. К. Тураўскі. | | 2 | 2 | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты |
| 2.2 | 1. Грамадска-палітычныя ідэі “Слова пра паход Ігаравы”.<br>2. Палітычныя ідэі старажытных летапісаў. Ідэя адзінства Русі. | | | | 2 | | [1; 2] | |
| **3** | **Тэма 3. Грамадска-палітычная думка ў перыяд станаўлення беларускага этнаса і ўмацавання дзяржаўнасці (другая палова XIII – XV ст.). Палітычныя ідэі беларуска-літоўскіх летапісаў (XIV–XVI стст.)**<br>1. Фарміраванне ВКЛ як поліэтнічнай дзяржавы: сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы.<br>2. Асаблівасці развіцця грамадска-палітычных працэсаў у ВКЛ.<br>3. Уплыў ідэалогіі каталіцызму на грамадска-палітычную думку ВКЛ. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.1 | 1. Прыняцце каталіцызму, знаёмства з заходнееўрапейскай царкоўна-палітычнай ідэалогіяй папства.<br>2. Сярэдневековыя ерасі.<br>3. Грамадска-палітычныя погляды і царкоўная дзейнасць Р. Цамблака.<br>4. Ідэя ўніі паміж праваслаўнай і каталіцкай царквамі ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі XIV-XV стст.<br>5. Беларуска-літоўскія летапісы і хронікі, як крыніцы актуальных грамадска-палітычных ідэй XIV – XV стст. | | 2 | | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты, эсэ |
| **4** | **Тэма 4. Грамадска-палітычная думка ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі (канец XV – сярэдзіна XVI ст.).**<br>1. Асноўныя ідэі і прынцыпы эпохі Адраджэння, іх асаблівасці ў Вялікім Княстве Літоўскім.<br>2. Грамадска-палітычныя погляды Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, М. Літвіна. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |
| 4.1 | 1. Уплыў заходнееўрапейскіх рэфармацыйных ідэй на развіцце палітычнай і прававой думкі ў ВКЛ.<br>2. Палітычныя погляды прадстаўнікоў лютэранства, кальвінізму, правага і левага крылаў арыян.<br>3. Грамадска-палітычныя погляды Л. Сапегі. | | 2 | | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты |
| **5** | **Тэма 5. Грамадска-палітычная думка ў гады контррэфармацыі (канец XVI – першая палова XVII ст.).**<br>**1.** Узнікненне Контррэфармацыі ў Еўропе, яе сутнасць, мэты.<br>**2.** Асноўныя прычыны распаўсюджвання контррэфармацыйнай ідэалогіі ў ВКЛ. Дзейнасць ордэна езуітаў ў Беларусі.<br>**3.** Брэсцкая царкоўная ўнія – імпульс у развіцці грамадска-палітычнай думкі Беларусі XVI – XVII стст. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |
| 5.1 | 1. Грамадска-палітычныя погляды прыхільнікаў уніі (П. Скарга, А. Пасевін, І. Руцкі, І. Кунцэвіч і інш.)<br>2. Грамадска-палітычныя погляды праціўнікаў уніі | | 2 | | 2 | | [1; 2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | (Л. і С. Зізаніі, М. Сматрыцкі, П. Магіла, А. Філіповіч і інш.).<br>3. Ідэалогія сарматызму і павелічэнне каставасці шляхецкага стану грамадства ў Рэчы Паспалітай.<br>4. Культурна-асветніцкая дзейнасць К. Астрожскага супраць каталіцкай ідэалогіі. | | | | | | | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты. |
| **6** | **Тэма 6. Грамадска-палітычная думка ў перыяд крызісу феадальна- прыгонніцкіх адносін і панавання клерыкальнай ідэалогіі (сярэдзіна XVII – першая палова XVIII ст.). Адлюстраванне асветніцкіх ідэй у палітычнай думцы Беларусі (XVIII ст).**<br>1. Уплыў войнаў і сацыяльных канфліктаў сярэдзіны XVII – першай паловы XVIII ст. на грамадска-культурнае жыццё беларускага грамадства.<br>2. Гістарычныя ўмовы развіцця Асветніцтва ў другой палове XVIII ст. Асаблівасці асветніцкай ідэалогіі ў Беларусі і Літве, яе супярэчлівасць, непаслядоўнасць.<br>3. Сутнасць ідэалогіі фізіакратызму і яе прадстаўнікі ў Беларусі (І. Страйноўскі, І. Храптовіч, А. Тызенгауз, П. Бжастоускі і інш.). | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |
| 6.1 | 1. Атэістычныя і сацыяльна-ўтапічныя погляды К. Лышчынскага. Трактат “Аб неіснаванні бога”.<br>2. Грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць С. Полацкага.<br>3. Грамадска-палітычныя ідэі Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Погляды лідэраў паўстання 1794 г. Т. Касцюшкі і Я. Ясінскага. | | 2 | | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты |
| 7 | **Тэма 7. Развіццё грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (1795 г. – канец XIX ст.).**<br>1. Праект адраджэння палітычнай самастойнасці ВКЛ М.К. Агінскага.<br>2. Палітычныя і прававыя погляды сяброў тайных студэнцкіх таварыстваў Віленскага ўніверсітэта і іншых навучальных устаноў Беларусі. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Ідэі культурна-нацыянальнага адраджэння ў літаратуры першай паловы XIX ст. | | | | | | | |
| 7.1 | 1. Адраджэнне лібералізму ў канцы 50-х – пачатку 60-х гг. Браты Я. і К. Тышкевічы, М. Балінскі, Т. Нарбут, Ю. Крашэўскі і інш.<br>2. Паўстанне 1863 – 1864 гг. і яго ўплыў на палітыку ўладаў Расійскай імперыі ў беларускіх губернях.<br>3. Погляды М. Каяловіча, І. Саланевіча, К. Гаворскага.<br>4. Рэвалюцыйна-дэмакратычны кірунак грамадска-палітычнай і прававой думкі Беларусі: М. Валовіч, Ю. Бакшанскі, браты Ц. і Ф. Далеўскія.<br>5. Франц Савіч і арганізацыя "Дэмакратычнае таварыства". | | 2 | | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты |
| **8** | **Тэма 8. Грамадская думка і палітычныя плыні ў канцы XIX - першай трэці XX ст.**<br>1. Грамадска-палітычныя погляды Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча.<br>2. Часопіс "Гоман" і яго праграма федэратыўнай аўтаноміі Беларусі.<br>3. Спалучэнне ідэі сялянскага (народніцкага) сацыялізма з патрабаваннем нацыянальнага адраджэння ў праграме БСГ.<br>4. Грамадска-палітычныя погляды І. Абдзіраловіча (Канчэускага). | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |
| 8.1 | 1. Станаўленне нацыянальна-дзяржаўнай ідэі ў праграмных дакументах беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску (БНК, ЦБР, ЦВБР, ВБР). Ідэі дакументаў, прынятых І-м Усебеларускім з’ездам (снежань 1917 г.).<br>2. Пытанні нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў праграмных дакументах БНР (Устаўныя граматы).<br>3. Абгрунтаванне права Беларусі на свабоднае дэмакратычнае развіццё ў творчай спадчыне ідэолагаў нацыянальнага Адраджэння І. і А. Луцкевічаў, В. Ластоускага, А. Смоліча, Я. Лёсіка, А. Цвікевіча і інш. | | 2 | | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты, эсэ |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8.2 | 1. Нацыянальна-асветніцкая і рэвалюцыйна-прапагандысцкая дзейнасць першых беларускамоўных газет: "Наша Доля" і "Наша Ніва".<br>2. Роля мастацкай літаратуры пачатку ХХ ст. у фарміраванні нацыянальнай свядомасці беларусаў (З. Жылуновіч, Я. Купала, Я. Колас, Цётка і інш.).<br>3. Распрацоўка канцэпцыі нацыянальнай дзяржаўнасці Беларускім народным камітэтам (БНК) у Вільні: Антон і Іван Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі. | | | 2 | 2 | | [1; 2] | |
| **9** | **Тэма 9. Грамадска-палітычная думка Савецкай Беларусі (1919–1939 гг.). Грамадска-палітычны рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.).**<br>1. Шляхі фарміравання беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай аснове. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.<br>2. Шляхі фарміравання беларускай дзяржаўнасці на рэвалюцыйна-класавай аснове. Стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці.<br>3. Грамадска-палітычная думка БССР у 1920-я гг. Ваенна-камуністычная ідэалогія і нацыянальнае пытанне. В. Кнорын. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |
| 9.1 | 1. Нацыянальна-арыентаваныя камуністы іх погляды на праблему беларускай дзяржаўнасці. А. Чарвякоў. В. Ігнатоўскі.<br>2. Ідэалогія нацыянал-дэмакратызму.<br>3. Замацаванне манаполіі камуністычнай партыі ў грамадска-палітычным жыцці БССР.<br>4. Дасягненні ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Беларусізацыя як частка нацыянальнай дзяржаўнай палітыкі.<br>5. Унутрыпартыйная барацьба ў БССР (1920-я гг.). Змены ў савецкай дзяржаўнай сістэме і іх адлюстраванне ў Канстытуцыі БССР 1937 г. | | 2 | | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты, эсэ |
| 9.2 | 1. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух ў Заходняй Беларусі.<br>2. Грамадска-палітычныя погляды дзеячоў | | | 2 | | | [1; 2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (І. Лагіновіч, А. Славінскі, С. Прытыцкі і інш.).<br>3. Ідэалогія Беларускай сялянска-работніцкай грамады.<br>4. Грамадска-палітычныя погляды беларускай дэпутацкай фракцыі польскага сейма ў 1928–1930 гг. «Змаганне».<br>5. Дзейнасць і погляды І. Дварчаніна, Б. Тарашкевіча, А. Станкевіча і інш. | | | | | | | |
| **10** | **Тэма 10. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР (1950-я – другая палова 1980-х гг.).**<br>1. Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.<br>2. Асаблівасці працэсу дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1950-х – 1964 гг.<br>3. Нарастанне кансерватызму ў грамадска-палітычным жыцці ў 1970-я – першай палове 1980-х гг. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |
| 10.1 | 1. Спробы рэфармавання палітычнай сістэмы ў гады перабудовы.<br>2. Пачатак пераходу да шматпартыйнасці.<br>3. Крытычны аналіз гісторыі СССР, палітычнай практыкі КПСС і савецкага кіраўніцтва ў палітычнай думцы.<br>4. Развіцце гістарычнай думкі (1950-я – другая палова 1980-х гг.). | | | 2 | 4 | | [1; 2] | |
| **11** | **Тэма 11. Грамадска-палітычная думка Рэспублікі Беларусь ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту (1990-2020-я гг.). Станаўленне новых духоўных каштоўнасцей ў грамадстве.**<br>1. Грамадска-палітычная думка Беларусі ва ўмовах распаду СССР.<br>2. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.<br>3. Пераход ад парламентскай да прэзідэнцкай рэспублікі. Распрацоўка і прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. і першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. | 2 | | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 11.1 | 1. Грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне падчас выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання. Першы рэспубліканскі рэферэндум 1995 г. і яго рашэнні.<br>2. Другі рэспубліканскансі рэферэндум 1996 г. і ліквідацыя супрацьстаяння заканадаўчай і выканаўчай галін улады.<br>3. Трэці рэспубліканскансі рэферэндум 2004 г. і яго рашэнне.<br>4. Сутнасць зменаў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь прынятых на чацвёртым рэспубліканскансмі рэферэндуме 2022 г.<br>5. Усебеларускі народны сход – вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь. | | 2 | | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты, эсэ |
| 11.2 | 1. Гісторыка-культурная спадчына Рэспублікі Беларусь.<br>2. Адлюстраванне грамадска-палітычнага стану грамадства ў сучасных творах літаратуры і мастацтва.<br>3. Узаемаадносіны дзяржавы і царквы, адраджэнне рэлігійна-канфесійнага жыцця.<br>4. Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы. | | | | 4 | | [1; 2] | |
| | **Усяго** | **22** | **18** | **8 сем.** | **52** | | | **Залік** |

**ВУЧЭБНА -МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**

**“Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі”**

**па спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны (завочная форма атрымання адукацыі)**

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | Метадычныя сродкі забяспячэння, дапаможнікі | Літаратура | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыйныя заняткі | Практычныя (семінарскія) заняткі | | | |
| 1 | **Тэма 1. Прадмет гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі як навукі і вучэбнай дысцыпліны. Метадалагія гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Крыніцы, перыядызацыя.**<br>1. Агульная характарыстыка “Гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі” як навуковай дысцыпліны.<br>2. Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння курса.<br>3. Перыядызацыя беларускага гісторыка-палітычнага працэсу.<br>4. Крыніцы вывучэння дадзенай дысцыпліны, яе актуальнасць. | 2 | | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |
| 2 | **Тэма 5. Грамадска-палітычная думка ў гады контррэфармацыі (канец XVI – першая палова XVII стст.).**<br>1. Грамадска-палітычныя погляды прыхільнікаў уніі (П. Скарга, А. Пасевін, І. Руцкі, І. Кунцэвіч і інш.)<br>2. Грамадска-палітычныя погляды праціўнікаў уніі (Л. і С. Зізаніі, М. Сматрыцкі, П. Магіла, А. Філіповіч і інш.).<br>3. Ідэалогія сарматызму і павелічэнне каставасці шляхецкага стану грамадства ў Рэчы Паспалітай.<br>4. Культурна-асветніцкая дзейнасць К. Астрожскага супраць каталіцкай ідэалогіі. | | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | **Тэма 7. Развіццё грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (1795 г. – канец XIX ст.).**<br>1. Адраджэнне лібералізму ў канцы 50-х – пачатку 60-х гг. Браты Я. і К. Тышкевічы, М. Балінскі,Т. Нарбут, Ю. Крашэўскі і інш.<br>2. Паўстанне 1863 – 1864 гг. і яго ўплыў на палітыку ўладаў Расійскай імперыі ў беларускіх губернях.<br>3. Погляды М. Каяловіча, І. Саланевіча, К. Гаворскага.<br>4. Рэвалюцыйна-дэмакратычны кірунак грамадска-палітычнай і прававой думкі Беларусі: М. Валовіч, Ю. Бакшанскі, браты Ц. і Ф. Далеўскія.<br>5. Франц Савіч і арганізацыя "Дэмакратычнае таварыства". | | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты |
| 4 | **Тэма 8. Грамадская думка і палітычныя плыні ў канцы XIX - першай трэці XX ст.**<br>1. Станаўленне нацыянальна-дзяржаўнай ідэі ў праграмных дакументах беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску (БНК, ЦБР, ЦВБР, ВБР). Ідэі дакументаў, прынятых першым Усебеларускім з'ездам (снежань 1917 г.).<br>2. Пытанні нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў праграмных дакументах БНР (Устаўныя граматы).<br>3. Абгрунтаванне права Беларусі на свабоднае дэмакратычнае развіццё ў творчай спадчыне ідэолагаў нацыянальнага Адраджэння І. і А. Луцкевічаў, В. Ластоўскага, А. Смоліча, Я. Лёсіка, А. Цвікевіча і інш. | | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты, эсэ |
| 5 | **Тэма 9. Грамадска-палітычная думка Савецкай Беларусі (1919-1939 гг.). Грамадска-палітычны рух у Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.).**<br>1. Нацыянальна арыентаваныя камуністы іх погляды на праблему беларускай дзяржаўнасці. А. Чарвякоў. В. Ігнатоўскі.<br>2. Ідэалогія нацыянал-дэмакратызму.<br>3. Замацаванне манаполіі камуністычнай партыі ў грамадска-палітычным жыцці БССР.<br>4. Дасягненні ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Беларусізацыя як частка нацыянальнай дзяржаўнай палітыкі.<br>5. Унутрыпартыйная барацьба ў БССР (1920-я гг.). Змены ў савецкай дзяржаўнай сістэме і іх адлюстраванне ў Канстытуцыі БССР 1937 г. | | 2 | | [1; 2] | Франтальнае апытанне па тэме, тэсты, эсэ |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | **Тэма 11. Грамадска-палітычная думка Рэпублікі Беларусь ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту (1990-2020-я гг.). Станаўленне новых духоўных каштоўнасцей ў грамадстве.**<br>1. Грамадска-палітычная думка Беларусі ва ўмовах распаду СССР.<br>2. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.<br>3. Пераход ад парламентскай да прэзідэнтскай рэспублікі. Распрацоўка і прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. і першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. | 2 | | Мультымедыйная прэзентацыя | [1; 2] | |
| | **Усяго** | **4** | **8** | | | **залік** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА


**Асноўная літаратура**

1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі / І. А. Марзалюк [і інш.] ; пад агул. рэд. І. А. Марзалюка. – 2-е выд., стэр. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2023. – 447 с.
2. Гісторыя грамадска-палітычнай думкі [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс / склад. А. Ф. Рацько // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/44938. – Дата доступу: 26.03.2024.

**Дадатковая літаратура**

1. Аргучинцев, Г. К. История белорусской государственности : учеб. пособие для студентов вузов / Г. К. Аргучинцев. – Минск : Амалфея, 2022. – 340 с.
2. Бабосов, Е. М. Основы идеологии белорусского государства : курс лекций / Е. М. Бабосов. – Минск : Амалфея, 2012. – 215 с.
3. Геноцид белорусского народа = Genocide of the belarusian people : информ.-аналит. материалы и док. / Генерал. прокуратура Респ. Беларусь ; под общ. ред. А. И. Шведа. – Минск : Беларусь, 2022. – 174 с.
4. Конституция Республики Беларусь = Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь = Constitution of the Republic of Belarus : с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г., 17 окт. 2004 г. и 27 февр. 2022 г. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2024. – 192 с.
5. Масленченко, С. В. Идеология белорусского государства : учеб. пособие / С. В. Масленченко ; Акад. М-ва внутр. дел Респ. Беларусь. – Минск : Акад. МВД, 2020. – 169 с.
6. Национальная стратегия устойчивого развития Республики Беларусь до 2035 года [Электронный ресурс] // Министерство экономики Республики Беларусь. – Режим доступа: https://economy.gov.by/uploads/files/ObsugdaemNPA/NSUR-2035-1.pdf. – Дата доступа: 26.03.2024.
7. Стратегические приоритеты развития государственной молодежной политики в Республике Беларусь до 2030 г. / Л. С. Кожуховская [и др.] ; Респ. ин-т высш. шк. ; под общ. ред. Л. С. Кожуховской. – Минск : РИВШ, 2020. – 246 с.

**Прыкладны спіс пытанняў да заліку па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі”**

1. Грамадская думка Беларусі дахрысціянскай эпохі. Язычніцтва.
2. Уплыў дзяржаў-княстваў і хрысціянства на фарміраванне грамадска-палітычнай думкі на беларускіх землях у IX-XIII стст.
3. Грамадска-палітычныя погляды Ефрасінні Полацкай, Кірыла Тураўскага, Клімента Смаляціча.
4. Канфесійная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі ў XIII-XV стст. Ідэя царкоўнай незалежнасці праз стварэнне аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў ВКЛ (дзейнасць Грыгорыя Цамблака).
5. Фарміраванне ў ВКЛ культуры эпохі Адраджэння, яе характэрныя рысы. Уплыў заходнееўрапейскай гуманістычнай філасофіі Адраджэння на развіццё палітычнай і прававой думкі ў ВКЛ.
6. Рэфармацыя ў ВКЛ, яе асаблівасці, асноўныя напрамкі. Палітычныя і прававыя ідэі Рэфармацыі.
7. Светапогляд, палітычныя і прававыя погляды Францыска Скарыны.
8. Палітычныя і прававыя погляды М.Гусоўскага.
9. Палітычныя і прававыя погляды С.Буднага.
10. Асноўныя прававыя ідэі і дзяржаўна-прававое значэнне Статутаў ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.
11. Сацыяльна-палітычныя погляды Пятра Гезкі (Пятра з Ганендза) і яго паслядоўнікаў: Якуба з Калінаўкі, Паўла з Візны і Марціна Чаховіца.
12. Светапогляд, грамадска-палітычныя і прававыя погляды Казіміра Лышчынскага.
13. Грамадска-палітычны рух у Беларусі напярэдадні і ў час вайны 1812 г. Праекты аднаўлення ВКЛ.
14. Палітычныя і прававыя погляды арганізатараў і кіраўнікоў філаматаў і філарэтаў Тамаша Зана, Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Ігната Дамейкі.
15. Ідэі культурна-нацыянальнага адраджэння ў літаратуры 1-й паловы XIX ст. Я. Баршчэўскі, А.Рыпінскі.
16. Асноўныя напрамкі грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў 2-й палове XIX ст. Узмацненне кансерватыўнага накірунка пасля паўстання 1830–1831 гг.
17. Ідэалогія “заходнерусізма”. Палітычныя погляды М.Каяловіча, Л.Саланевіча, К.Гаворскага.
18. Рэвалюцыйна-дэмакратычны накірунак грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі.
19. Распаўсюджанне ідэалогіі народніцтва ў Беларусі. Спецыфічныя рысы народніцтва на беларускіх землях.
20. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі ў канцы XIX – пачатку XX стст. Асаблівасці фарміравання беларускай нацыі.
21. Палітычныя ідэі ў творчасці Ф.Багушэвіча.

22. Творчая спадчына ідэолагаў нацыянальнага адраджэння (В.Іваноўскі, І. і А.Луцкевічы, В.Ластоўскі, М.Доўнар-Запольскі).
23. Нацыянальна-асветніцкая і рэвалюцыйна-прапагадысцкая дзейнасць газет “Наша Доля” і “Наша Ніва”.
24. Уплыў мастацкай літаратуры пачатка XX ст. на фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў (Я.Купала, Я.Колас, Э.Пашкевіч, М.Багдановіч).
25. Грамадска-палітычная думка ў перыяд станаўлення беларускай дзяржаўнасці (1918–1920-я гг.).
26. Грамадска-палітычная думка на тэрыторыі Беларусі ў 1920-я – 1930-я гг.
27. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у сярэдзіне 50-х – сярэдзіне 60-х гг. XX ст.
28. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у другой палове 60-х – канцы 80-х гг. XX ст.
29. Канстытуцыйны працэс у Рэспубліцы Беларусь і яго адлюстраванне ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі.
30. Ідэалогія беларускай дзяржаўнасці ў грамадска-палітычнай думцы Рэспублікі Беларусь.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі»

Мэтай метадычных рэкамендацый з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці вучэбнага працэсу, у тым ліку дзякуючы самастойнай рабоце, у якой студэнт становіцца актыўным суб'ектам навучання, што азначае:

- здольнасць займаць у навучанні актыўную пазіцыю;
- магчымасць мабілізаваць інтэлектуальныя і валявыя намаганні для дасягнення вучэбных мэтаў;
- уменне праектаваць, планаваць і прагназаваць вучэбную дзейнасць;
- звычку ініцыяваць сваю пазнавальную дзейнасць на аснове ўнутранай станоўчай матывацыі;
- усведамленне сваіх патэнцыяльных вучэбных магчымасцей і псіхалагічную падрыхтаванасць скласці праграму дзейнасці па самаразвіццю.

### Віды самастойнай работы студэнтаў

| | |
|---|---|
| Рэпрадуктыўная самастойная работа | Самастойнае азнаямленне, прагляд, канспектаванне вучэбнай літаратуры, праслухоўванне лекцый, завучванне, пераказ, запамінанне, інтэрнэт-рэсурсы, паўтарэнне вучэбнага матэрыялу |
| Пазнавальна-пошуквая самастойная работа | Падрыхтоўка паведамленняў, дакладаў, выступленняў на семінарскіх і практычных занятках, падбор літаратуры па праблемах дысцыпліны, кантрольных, курсавых работ і інш. |
| Творчая самастойная работа | Падрыхтоўка тэзісаў і навуковых артыкулаў, удзел у навукова-даследчай рабоце, падрыхтоўка дыпломнай работы (праекта), удзел у студэнцкай навуковай канферэнцыі, студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі |

### Арганізацыя кантролю самастойнай работы

Для паспяховага выканання самастойнай работы студэнтаў неабходна планаванне і кантроль з боку выкладчыкаў. Аўдыторная самастойная работа выконваецца студэнтамі на лекцыях, семінарскіх занятках, таму выкладчык павінен загадзя пабудаваць сістэму самастойнай работы з улікам яе форм, мэты, адбіраючы вучэбную і навуковую інфармацыю і сродкі камунікацый, прадумваючы ролю студэнта ў гэтым працэсе і свой удзел у ім.

Пытанні для самастойнай працы студэнтаў, названыя ў вучэбнай праграме дысцыпліны, прапануюцца выкладчыкамі ў пачатку вывучэння дысцыпліны.

**Змест дзейнасці выкладчыка і студэнта пры выкананні самастойнай работы**

| Асноўныя характарыстыкі | Дзейнасць выкладчыка | Дзейнасць студэнтаў |
|---|---|---|
| Мэта выканання СР | -тлумачыць мэту і сэнс выканання СР;<br>-дае разгорнуты інструктаж аб патрабаваннях, прад'яўляемых да СР і спосабах яе выканання;<br>-дэманструе ўзор СР | -разумее і прымае мэту СР як асобасна значную;<br>-знаёміцца з патрабаваннямі да СР |
| Матывацыя | -раскрывае тэарэтычную і практычную значнасць выканання СР, тым самым фарміруе ў студэнта пазнавальную патрэбу і гатоўнасць да выканання СР;<br>матывуе студэнта на дасягненне поспеху | -фарміруе ўласную пазнавальную патрэбу ў выкананні СР;<br>-фарміруе ўстаноўку і прымае рашэнне аб выкананні СР |
| Кіраванне | -ажыццяўляе кіраванне шляхам мэтанакіраванага ўздзеяння на працэс выканання СР;<br>-дае агульныя арыенціры выканання СР | -на аснове валодання абагульненым прыёмам сам ажыццяўляе кіраванне СР (праектуе, плануе, рацыянальна размяркоўвае час і г.д.) |
| Кантроль і карэкцыя выканання | -ажыццяўляе папярэдні кантроль, які прадугледжвае выяўленне зыходнага ўзроўню гатоўнасці студэнта да выканання СР;<br>-ажыццяўляе выніковы кантроль канчатковага выніку выканання СР | -ажыццяўляе бягучы аперацыйны самакантроль за ходам выканання СР;<br>-выяўляе, аналізуе і выпраўляе дапушчаныя памылкі, уносіць карэктывы ў работу, адсочвае ход выканання СР;<br>-вядзе пошук аптымальных спосабаў выканання СР;<br>-ажыццяўляе рэфлексіўнае стаўленне да ўласнай дзейнасці;<br>-ажыццяўляе выніковы самакантроль выніку СР |

| | | |
|---|---|---|
| Ацэнка | -на аснове параўнання выніку з узорам, загадзя зададзенымі крытэрамі дае ацэнку СР;<br>-выяўляе тыповыя памылкі, падкрэслівае станоўчыя і адмоўныя бакі, дае метадычныя парады па выкананні СР, намячае далейшыя шляхі выканання СР;<br>-устанаўлівае ўзровень і вызначае прагрэс студэнта, фарміруе ў яго матывацыю дасягнення поспеху ў вучэбнай дзейнасці | -на аснове суаднясення выніка з мэтай дае самаацэнку СР, сваім пазнавальным магчымасцям, здольнасцям і якасцям |

Пазааўдыторная самастойная работа студэнтаў (далей самастойная праца) – планаваная вучэбная, вучэбна-даследчая, навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў, якая ажыццяўляецца ў пазааўдыторны час па заданні і пры метадычным кіраўніцтве выкладчыка, але без яго непасрэднага ўдзелу. Яна ўключае ў сябе:

- падрыхтоўку да аўдыторных заняткаў (лекцый, практычных, семінарскіх і інш.) і выкананне адпаведных заданняў;
- самастойную работу над асобнымі тэмамі навучальных дысцыплін у адпаведнасці з вучэбна-тэматычнымі планамі;
- напісанне дакладаў, эсэ;
- выкананне пісьмовых кантрольных работ;
- падрыхтоўку да ўсіх відаў кантрольных выпрабаванняў;
- удзел у навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, семінарах, кангрэсах і т.п.

Выкананне любога віду самастойнай работы прадугледжвае праходжанне студэнтамі наступных этапаў:

- вызначэнне мэты самастойнай работы;
- канкрэтызацыя пазнавальнай (праблемнай або практычнай) задачы;
- самаацэнка гатоўнасці да самастойнай працы па рашэнні пастаўленай задачы;
- выбар адэкватнага спосабу дзеянняў, які вядзе да вырашэння задачы (выбар шляхоў і сродкаў для яе рашэння);
- планаванне (самастойна ці з дапамогай выкладчыка) самастойнай работы па рашэнні задачы;
- рэалізацыя праграмы выканання самастойнай работы.

## Метадычныя парады і рэкамендацыі да заданняў

Усе тыпы заданняў, што выконваюцца студэнтамі, у тым ліку ў працэсе самастойнай работы, так ці інакш утрымліваюць устаноўку на набыццё і замацаванне Дзяржаўным адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі аб’ёму ведаў, а таксама на фарміраванне ў рамках гэтых ведаў некаторых навыкаў разумовых аперацый – уменне ацэньваць, аналізаваць, параўноўваць, каментаваць і г.д. Некаторыя заданні патрабуюць тлумачэння:

1. Пракаментаваць выказванне – растлумачыць, якая ідэя пакладзена ва ўрыўку, аб якой пазіцыі яе аўтара яна сведчыць.

2. Параўнаць – выявіць падабенства і адрозненне пазіцый па пэўных прыкметах.

3. Абгрунтаваць адзін з некалькіх прапанаваных варыянтаў адказу - прывесці аргументы на карысць правільнасці выбранага варыянту адказу і паказаць, у чым памылковасць іншых варыянтаў.

4. Аргументаваць (абгрунтаваць, даказаць, растлумачыць) адказ.

5. Правесці аналіз – раскласці вывучаемыя з’явы на складовыя часткі, супаставіць іх з мэтай выяўлення ў іх істотнага і неабходнага.

6. Тэзісна выкласці ідэю, канцэпцыю, тэорыю – з выкарыстаннем матэрыялу вучэбных дапаможнікаў і іншай літаратуры, коратка, але не ў шкоду зместу сфармуляваць асноўныя палажэнні вучэння.

7. Адлюстраваць схематычна – значыць раскрыць змест адказу ў выглядзе табліцы, малюнка, дыяграмы і іншых графічных формаў.

Важным складнікам самастойнай пазааўдыторнай падрыхтоўкі з’яўляецца праца з літаратурай па ўсіх відах заняткаў: семінарскіх, практычных, пры падрыхтоўцы да залікаў, экзаменаў, тэсціравання, удзелу ў навуковых канферэнцыях.

Уменне працаваць з літаратурай азначае навучыцца асэнсавана карыстацца крыніцамі. Перш чым прыступіць да засваення навуковай літаратуры, рэкамендуецца чытанне падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.

Вывучэнне навуковай, вучэбнай і іншай літаратуры патрабуе вядзення працоўных запісаў.

Форма запісаў можа быць вельмі разнастайнай: просты або разгорнуты план, тэзісы, цытаты, канспект. Студэнтам рэкамендуецца самастойна выконваць даклады, індывідуальныя пісьмовыя заданні і практыкаванні, прапанаваныя пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў. Праца, звязаная з рашэннем гэтых задач і практыкаванняў, уяўляе сабой від інтэлектуальнай практычнай дзейнасці. Яна спрыяе выпрацоўцы ўмення і звычкі рабіць што-небудзь правільна, а таксама замацаванню навыкаў і ведаў па праблеме.

Метадычныя рэкамендацыі па напісанні пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў

Напісанне пісьмовых навукова-даследчых работ студэнтаў вырашае шэраг задач:

- навучанне студэнтаў самастойнаму пошуку і адбору вучэбнай і спецыяльнай навуковай літаратуры па прадмеце;

- выпрацоўка ўменняў падрыхтоўкі дакладаў, выступаў і паведамленняў;

- набыццё вопыту выступленняў з дакладамі на семінарскіх занятках;

- сістэматызацыя, замацаванне і пашырэнне тэарэтычных і практычных ведаў і навыкаў па вывучаемых дысцыплінах;

- далучэнне студэнтаў да вырашэння праблемных пытанняў па абранай тэме работы;

- навучанне студэнтаў выкладаць матэрыял у выглядзе стройнай сістэмы тэарэтычных палажэнняў, звязаных лагічнай паслядоўнасцю і падмацаваных прыкладамі з практыкі.

## Пералік заданняў і кантрольных мерапрыемстваў па кіруемай самастойнай рабоце студэнта

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін | Від заданняў | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Тэма 2. Зараджэнне грамадска-палітычнай думкі на беларускіх землях у XI–XIII стст. Палітычны змест старажытнарускіх летапісаў.** | **2 сем.** | **Першы модуль**<br>**На падставе зместу вучэбнай літаратуры падрыхтаваць канспект па наступных пытаннях:**<br>1. Прычыны і гістарычныя ўмовы распаўсюджвання хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях.<br>2. Сутнасць ідэалогіі цэзарапапізма і прычыны яе зацвярджэння ў палітычнай думцы Беларусі XI-XIII стст.<br>**Другі модуль**<br>**Падрыхтаваць даклад на тэму:**<br>Барацьба хрысціянскай царквы за ідэалагічную манаполію ў духоўным жыцці ўсходнеславянскага грамадства.<br>**Трэці модуль**<br>**Напісанне эсэ на тэму:** "Рэлігійна-асветніцкія дзейнасць Е. Полацкай і яе роля ў распаўсюджванні хрысціянскай маралі ў Полацкай зямлі". | **Канспект**<br><br>**Даклад**<br><br>**Эсэ** |
| **2** | **Тэма 8. Грамадская думка і палітычныя плыні ў канцы XIX - першай трэці XX ст.** | **2 сем.** | **Першы модуль**<br>**На падставе зместу вучэбнай літаратуры падрыхтаваць канспект па наступных пытаннях:**<br>1. Нацыянальна-асветніцкая і рэвалюцыйна-прапагандысцкая дзейнасць першых беларускамоўных газет: "Наша Доля" і "Наша Ніва".<br>2. Роля мастацкай літаратуры пачатку XX ст. у фарміраванні нацыянальнай свядомасці беларусаў.<br>**Другі модуль**<br>**Падрыхтаваць даклад на тэму:**<br>"Палітычныя плыні ў канцы XIX - першай трэці XX ст.".<br>**Трэці модуль**<br>**Падрыхтаваць прэзентацыю па тэме:** "Грамадска-палітычныя погляды Антона і Івана Луцкевічаў". | **Канспект**<br><br>**Даклад**<br><br>**Прэзентацыя з яе абаронай** |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3 | **Тэма 9. Грамадска-палітычная думка Савецкай Беларусі (1919-1939 гг.). Грамадска-палітычны рух у Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.).** | **2 сем.** | **Першы модуль**<br>**На падставе зместу вучэбнай літаратуры падрыхтаваць канспект па наступных пытаннях:**<br>1. Адлюстраванне заходнебеларускага рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў грамадска-палітычнай думцы.<br>2. Дзейнасць Беларускай сялянска-рабочай грамады.<br>**Другі модуль**<br>**Падрыхтаваць даклад на тэму:** "Роля Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў развіцці нацыянальна-вызваленчага руху".<br>**Трэці модуль**<br>**Падрыхтуйце паведамленне і прэзентацыю на адну з наступных тэм:**<br>1. Дзейнасць і погляды Б. Тарашкевіча.<br>2. Дзейнасць беларускай дэпутацкай фракцыі польскага сейма "Змаганне" ў 1928—1930 гг. | **Канспект**<br><br>**Даклад**<br><br>**Эсэ** |
| 4 | **Тэма 10. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР (1950-я – другая палова 1980-х гг.).** | **2 сем.** | **Першы модуль**<br>**На падставе зместу вучэбнай літаратуры падрыхтаваць канспект па наступных пытаннях:**<br>1. Спробы рэфармавання палітычнай сістэмы ў гады перабудовы.<br>2. Пачатак пераходу да шматпартыйнасці.<br>**Другі модуль**<br>**Падрыхтаваць даклад на тэму:** "Палітычная практыка КПСС і савецкага кіраўніцтва ў палітычнай думцы".<br>**Трэці модуль**<br>**Падрыхтуйце эсэ на тэму:** "Развіцце гістарычнай думкі (1950-я – другая палова 1980-х гг.)". | **Канспект**<br><br>**Даклад**<br><br>**Эсэ** |

**Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі”**

| № п/п | Назва тэмы | Кол-ць гадзін для СРС | Заданне | Формы выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Тэма 1. Прадмет гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі як навукі і вучэбнай дысцыпліны. Метадалагія гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Крыніцы, перыядызацыя.** | 2 | **Складанне апорнага канспекта па пытаннях тэмы:**<br>1. Перыядызацыя беларускага гісторыка-культурнага працэсу.<br>2. Крыніцы вывучэння дадзенай праблемы яе актуальнасць. | Апорны канспект |
| 2 | **Тэма 2. Зараджэнне грамадска-палітычнай думкі на беларускіх землях у XI–XIII стст. Палітычны змест старажытнарускіх летапісаў.** | 6 | **Падрыхтоўка дакладаў па пытаннях тэмы:**<br>1. Кіеўская Русь і яе роля ў гісторыі ўсходнеславянскіх народаў. Полацкае і Тураўскае княствы.<br>2. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя фактары, якія ўплывалі на фармаванне ўсходнеславянскай грамадска-палітычнай думкі.<br>3. Прычыны і гістарычныя ўмовы распаўсюджвання хрысціянства ва ўсходнеславянскіх землях.<br>4. Барацьба хрысціянскай царквы за ідэалагічную манаполію ў духоўным жыцці ўсходнеславянскага грамадства.<br>5. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы і іх роля ў распаўсюджванні хрысціянскай маралі. Е.Полацкая. К.Смаляціч. К.Тураускі.<br>6. Грамадска-палітычныя ідэі “Слова пра паход Ігаравы”. | Даклад |
| 3 | **Тэма 3. Грамадска-палітычная думка ў перыяд станаўлення беларускага этнаса і ўмацавання дзяржаўнасці (другая палова XIII-XV ст.). Палітычныя ідэі беларуска-літоўскіх летапісаў (XIV–XVI стст.).** | 4 | **Складанне апорнага канспекта па пытаннях тэмы:**<br>1. Асаблівасці развіцця грамадска-палітычных працэсаў у ВКЛ.<br>2. Уплыў ідэалогіі каталіцызму на грамадска-палітычную думку Вялікага Княства Літоўскага.<br>3. Ідэя ўніі паміж праваслаўнай і каталіцкай царквамі ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі XIV–XV ст.ст. | Апорны канспект |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | 4. Беларуска-літоўскія летапісы і хронікі, як крыніцы актуальных грамадска-палітычных ідэй XIV – XV стст. | |
| 4 | **Тэма 4. Грамадска-палітычная думка ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі (канец XV – сярэдзіна XVI ст.).** | 4 | **Фарміраванне інфармацыйнага блока па пытаннях тэмы:**<br>1. Асноўныя ідэі і прынцыпы эпохі Адраджэння, іх асаблівасці ў Вялікім Княстве Літоўскім.<br>2. Палітычныя погляды прадстаўнікоў лютеранства, кальвінізму, правага і левага крылаў арыян.<br>**3.** Грамадска-палітычныя погляды Л. Сапегі. | Інфармацыйны блок |
| 5 | **Тэма 5. Грамадска-палітычная думка ў гады контррэфармацыі (канец XVI – першая палова XVII стст.).** | 4 | **Падрыхтоўка эсэ па наступных пытаннях:**<br>1. Брэсцкая царкоўная ўнія – імпульс у развіцці грамадска-палітычнай думцы Беларусі XVI – XVII стст.<br>2. Ідэалогія сарматызму і павелічэнне каставасці шляхецкага стану грамадства ў Рэчы Паспалітай.<br>3. Культурна-асветніцкая дзейнасць К. Астрожскага супраць каталіцкай ідэалогіі. | Эсэ |
| 6 | **Тэма 6. Грамадска-палітычная думка ў перыяд крызісу феадальна прыгонніцкіх адносін і панавання клерыкальнай ідэалогіі (сярэдзіна XVII – першая палова XVIII ст.). Адлюстарванне асветніцкіх ідэй у палітычнай думцы Беларусі (XVIII ст).** | 4 | **Фарміраванне інфармацыйнага блока па пытаннях тэмы:**<br>1. Гістарычныя ўмовы развіцця Асветніцтва ў другой палове XVIII ст. Асаблівасці асветніцкай ідэалогіі ў Беларусі і Літве, яе супярэчлівасць, непаслядоўнасць.<br>2. Сутнасць ідэалогіі фізіакратызму і яе прадстаўнікі ў Беларусі (І. Страйноускі, І. Храптовіч, К. Багуслаўскі і інш.).<br>3. Грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць С. Полацкага.<br>4. Грамадска-палітычныя ідэі Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Погляды лідэраў паўстання 1794 г. Т. Касцюшкі і Я. Ясінскага. | Інфармацыйны блок |
| 7 | **Тэма 7. Развіцце грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (1795 г. – канец XIX ст.).** | 4 | **Фарміраванне інфармацыйнага блока па пытаннях тэмы:**<br>1. Палітычныя і прававыя погляды сяброў тайных студэнцкіх таварыстваў Віленскага універсітэта – філаматаў і філарэтаў.<br>2. Погляды М. Каяловіча, І. Саланевіча, К. Гаворскага.<br>3. Рэвалюцыйна-дэмакратычны кірунак грамадска-палітычнай і прававой думкі Беларусі: М. Валовіч, Ю. Бакшанскі, браты Ц. і Ф. Далеўскія.<br>4. Франц Савіч і арганізацыя "Дэмакратычнае таварыства". | Інфармацыйны блок |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 8 | **Тэма 8. Грамадская думка і палітычныя плыні ў канцы XIX - першай трэцці XX ст.** | 6 | **Падрыхтоўка прэзентацыі па пытаннях тэмы (па выбару студэнта):**<br>1. Спалучэнне ідэі сялянскага (народніцкага) сацыялізма з патрабаваннем нацыянальнага адраджэння ў праграме БСГ.<br>2. Станаўленне нацыянальна-дзяржаунай ідэі ў праграмных дакументах беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску (БНК, ЦБР, ЦВБР, ВБР).<br>3. Нацыянальна-асветніцкая і рэвалюцыйна-прапагандысцкая дзейнасць першых беларускамоуных газет: "Наша Доля" і "Наша Ніва".<br>4. Роля мастацкай літаратуры пачатку XX ст. у фарміраванні нацыянальнай свядомасці беларусау (З. Жылуновіч, Я. Купала, Я. Колас, Цетка і інш.).<br>5. Распрацоука канцэпцыі нацыянальнай дзяржаунасці Беларускім народным камітэтам (БНК) у Вільні: Антон і Іван Луцкевічы, Вацлаў Ластоускі. | Камп’ютэрная прэзентацыя |
| 9. | **Тэма 9. Грамадска-палітычная думка Савецкай Беларусі (1919-1939 гг.). Грамадска-палітычны рух у Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.).** | 4 | **Падрыхтоўка эсэ па наступных пытаннях:**<br>1. Грамадска-палітычная думка БССР у 1920-я гг. Ваенна-камуністычная ідэалогія і нацыянальнае пытанне.<br>2. Дасягненні ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва.<br>3. Беларусізацыя як частка нацыянальнай дзяржаўнай палітыкі.<br>4. Унутрыпартыйная барацьба ў БССР (1920-я гг.).<br>5. Змены ў савецкай дзяржаўнай сістэме і іх адлюстраванне ў Канстытуцыі БССР 1937 г. | Эсэ |
| 10 | **Тэма 10. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР (1950-я – другая палова 1980-х гг.).** | 6 | **Складанне канспект па пытаннях тэмы**:<br>1. Асаблівасці працэсу дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1950-х – 1964 гг.<br>2. Нарастанне кансерватызму ў грамадска-палітычным жыцці ў 1970-я – першай палове 1980-х гг.<br>3. Пачатак пераходу да шматпартыйнасці.<br>4. Крытычны аналіз гісторыі СССР, палітычнай практыкі КПСС і савецкага кіраўніцтва ў палітычнай думцы.<br>5. Развіцце гістарычнай думкі (1950-я – другая палова 1980-х гг.). | Канспект |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 11 | **Тэма 11. Грамадска-палітычная думка Рэспублікі Беларусь ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту (1990-2020-я гг.). Станаўленне новых духоўных каштоўнасцей ў грамадстве.** | 8 | **Падрыхтоўка творчых заданняў па наступных пытаннях тэмы:**<br>1. Грамадска-палітычная думка Беларусі ва ўмовах распаду СССР.<br>2. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.<br>3. Пераход ад парламенцкай да прэзідэнукай рэспублікі. Распрацоўка і прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. і першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.<br>4. Змест і значэнне рэферэндумаў 1995, 1996, 2004 і 2022 гг.<br>5. Адлюстраванне грамадска-палітычнага стану грамадства ў сучасных творах літаратуры і мастацтва.<br>6. Гісторыка-культурная спадчына Рэспублікі Беларусь. | Абарона творчых заданнняў |
| | **Усяго** | **52** | | |

**Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі**

| Балы | Крытэрыі ацэнкі |
|---|---|
| залічана | дастатковы аб'ём ведаў у аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць вывады без істотных памылак;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні стандартных задач;<br>уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя тыпавыя задачы;<br>уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вучэбнай дысцыпліне і даваць ім ацэнку;<br>работа пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў |
| не залічана | недастаткова поўны аб'ём ведаў у аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выкладанне адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;<br>недастатковае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць у рашэнні стандартных задач; няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках вывучаемай вучэбнай дысцыпліны;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў;<br>адсутнасць ведаў і кампетэнцый у аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне, адмова ад адказу, няяўка на атэстацыю без уважлівай прычыны |

## ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

Для кантролю кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:

1. Вусная форма:
- паведамленні,
- вуснае апытанне,
- залік,
- даклад,
- абарона прэзентацый.

2. Пісьмовая форма:
- тэсты,
- эсэ.

3. Вусна-пісьмовая форма:
- справаздачы па аўдыторных семінарскіх заняткаў з наступнай вуснай абаронай,
- справаздачы па самастойнай працы студэнтаў з наступнай вуснай абаронай.

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ**
**вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя грамадска-палітычнай думкі Беларусі” з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі спецыяльнасцей**

| **Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне** | **Назва кафедры** | **Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне** | **Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму** |
|---|---|---|---|
| Гісторыя Беларусі (другая палова XIII ст. – сярэдзіна XVI ст.) | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Узгоднена на ўзроўні вучэбных праграм | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 12 ад 28. 04. 2021) |
| Гісторыя Беларусі (канец XVIII ст. – сярэдзіна XIX ст.) | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Узгоднена на ўзроўні вучэбных праграм | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 9 ад 30.03.2022) |
| Гісторыя Беларусі (канец XVIII ст. – сярэдзіна XIX ст.) | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Узгоднена на ўзроўні вучэбных праграм | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 9 ад 30.03.2022) |
| Гісторыя Беларусі (1918 – 1939 гг.) | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Узгоднена на ўзроўні вучэбных праграм | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 10 ад 21.03.2023) |
| Гісторыя Беларусі (1939 г. – першая чвэрць XXI ст.) | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Узгоднена на ўзроўні вучэбных праграм | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 8 ад 26.03.2024) |